**II.** Ажы́ны — паўкустовая расліна з роду малін. Пладаносіць на двухгадовых парастках, якія за перыяд вегетацыі дасягаюць 4—6 метраў у даўжыню, утвараючы сапраўдныя зараснікі. Найбольш распаўсюджаныя гатункі ажын — «збытная», «тэхас», «чарнаплодная» і інш. Памер ягад — ад сярэдніх да вельмі буйных (10—12 г).

Запішыце тэкст I, раскрываючы дужкі.

**41.** Пазнайце кветку па апісанні. Адгадайце загадку А. Церашковай.

Жоўтае сонейка ў белых пялёстках —
Кожны з нас ведае кветачку простую.
П'ём[ф] з ёй гарбату (прастуда міне),
З ёю варожым (кахае ці не).

Сродкі якога стылю выкарыстоўвае аўтар для апісання кветкі? Абгрунтуйце сваю думку.

Якія звесткі можна выкарыстаць для навуковага апісання кветкі? Апішыце кветку ў навуковым стылі. Раскажыце, які выгляд яна мае, дзе і як выкарыстоўваецца.

**42.** Выпішыце з любога падручніка для 6-га класа прыклад тэксту навуковага стылю. Пры неабходнасці запішыце тэкст па-беларуску. Падкрэсліце характэрныя для яго лексічныя сродкі.

## § 8. Афіцыйны стыль маўлення, яго жанры, сфера выкарыстання

**43.** Прачытайце тэкст. Для каго і з якой мэтай ён напісаны?

**Артыкул 2. Дзяржаўныя мовы, іншыя мовы ў Рэспубліцы Беларусь**

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы. Рэспубліка Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця *(Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь»)*.

**44.** Прачытайце табліцу. Раскажыце на яе аснове аб прыметах афіцыйнага стылю.

| АФІЦЫЙНЫ СТЫЛЬ | | | |
|---|---|---|---|
| **Прыметы стылю** | | | |
| **з якой мэтай выкарыстоўваецца** | **дзе выкарыстоўваецца** | **моўныя сродкі** | **жанры** |
| даць канкрэтныя ўказанні, парады, прадпісанні, паведаміць інфармацыю | у справаводстве, галіне заканадаўства, права | словы — назвы розных афіцыйных асоб, устаноў, дакументаў | аб'ява, заява; закон, указ, пастанова, загад |

Для афіцыйнага стылю характэрны:
- канкрэтнасць і дакладнасць;
- адсутнасць эмацыянальнасці, вобразнасці;
- ужыванне слоў толькі ў прамым значэнні.

**45.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго прыналежнасць да афіцыйнага стылю.




Канстытуцыя — Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь, які вызначае лад дзяржавы, правы́, свабоды і абавязкі грамадзян і мае вышэйшую юрыдычную сілу. Канстытуцыя замацоўвае дамоўленасць паміж грамадствам (грамадзянамі) і дзяржавай па самых важных для грамадства пытаннях.

15 сакавіка адзначаецца Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Выконваць Канстытуцыю, умацоўваць дзяржаўна-прававыя адносіны — патрыятычны абавязак кожнага з нас.

Якая роля Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у жыцці народа?

Калі адзначаецца дзяржаўнае свята — Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**46.** Прачытайце. Абгрунтуйце прыналежнасць тэксту да афіцыйнага стылю.

**Аб'ява**

У сераду, 15 лістапада, у 14 гадзін у актавай зале адбудзецца лекцыя на тэму «Сродкі бяспекі ў інтэрнэце». Лектар — старшы інспектар па справах непаўналетніх В. А. Голуб.

Запрашаюцца вучні 5—7-х класаў.

*Адміністрацыя школы.*

Якая задача гэтага тэксту? Якія часткі ў ім можна выдзеліць? Якія часціны мовы пераважаюць у тэксце? Як вы думаеце чаму?

!

У **аб'яве** паведамляецца пра мерапрыемства (канцэрт, экскурсію, сустрэчу з пісьменнікам, заняткі гуртка і інш.). Дакладна называецца дата, час і месца правядзення мерапрыемства.

Унізе, з правага боку, звычайна ўказваецца, хто робіць аб'яву.

**47.** Напішыце аб'яву аб пасяджэнні гуртка (напрыклад, беларускай мовы, чытальнікаў «Жывое слова», аматараў птушак і інш.).

**48.** Прачытайце тэкст паведамлення. Каму яно адрасавана? Ці ёсць у ім прыметы афіцыйнага стылю? Назавіце іх.

**Як трэба паводзіць сябе з інтэрнэт-тролем?**

1. Не карміце троля. Яму патрэбна ваша ўвага. Ён радуецца, калі ўдалося вывесці некага з раўнавагі. Ігнаруйце яго!
2. Не плюсуйце, не мінусуйце.
3. Не адказвайце ў каментарыях.
4. Пазначайце як спам, чорны спіс.

Ці сутыкаліся вы калі-небудзь з інтэрнэт-тролем?

Як трэба паводзіць сябе ў інтэрнэце, калі вас адкрыта абражаюць, зневажаюць, спецыяльна выводзяць з раўнавагі?

Падрыхтуйцеся і правядзіце гутарку на тэму «Тролінг у інтэрнэце».

**49.** Разгледзьце ўзор напісання адраса на канверце. Што размешчана ў левым верхнім вугле, што — у правым ніжнім?

Хто такі адпраўнік (адпраўшчык)?

Хто такі атрымальнік?




***пісáць на áдрас***

**50.** Уявіце сітуацыю. Ваш клас прымае ўдзел у арганізацыі сустрэчы са знакамітым земляком (ветэранам вайны, працы, пісьменнікам, касманаўтам і г. д.). Вам даручылі (ад імя класа) напісаць запрашэнне гэтаму чалавеку з просьбай прыняць удзел у мерапрыемстве. Што трэба напісаць у запрашэнні? Падпішыце адрас.

## § 9. Публіцыстычны стыль, яго жанры, сфера выкарыстання

**51.** Выразна прачытайце тэкст. У чым хоча пераканаць нас аўтар?

### Дзень народнага адзінства

17 верасня ў Беларусі адзначаецца дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства. Гэта свята сімвалізуе нацыянальную, дзяржаўную і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.

У 1921 годзе па ўмовах Рыжскага дагавора заходняя частка нашай краіны была ўключана ў састаў Польшчы. Амаль 20 гадоў беларускі народ падзяляла мяжа. Але 17 верасня 1939 года Чырвоная армія перайшла мяжу з Польшчай і пачала вызваленчы паход. Яго вынікам стала аб'яднанне Заходняй Беларусі і БССР. Нарэшце спраўдзілася мара беларусаў — жыць у адной дзяржаве.

Наша адзінства — сапраўдная нацыянальная каштоўнасць, якую неабходна паважаць, берагчы і абараняць! *(Паводле В. Ванінай)*.

Чаму Дзень народнага адзінства адзначаецца 17 верасня? У чым сутнасць гэтага свята?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі